# Выбіраем разам лепшую паштовую марку Рэспублікі Беларусь 2018 года!

З 28 студзеня па 28 лютага 2019 года ўсе жадаючыя запрашаюцца паўдзельнічаць у конкурсе-апытанні «Лепшая паштовая марка Рэспублікі Беларусь 2018 года».

Для гэтага неабходна:
1. Зайсці на сайт РУП «Белпошта» у раздзел «Філатэлія» http://www.belpost.by , запампаваць бланк анкеты, запоўніць яго, пазначыўшы нумар паштовай маркі або паштовага блока, які больш за ўсё Вам спадабаўся, і даслаць на электронны адрас vinch@belpost.by;

2. Наведаць любое аддзяленне паштовай сувязі краіны, дзе можна азнаёміцца з умовамі конкурсу і запоўніць прапанаваную анкету. Разборліва запоўненую анкету з пометкай «Конкурс» накіраваць па адрасе: Выдавецкі цэнтр «Марка» РУП «Белпошта», пр. Незалежнасці, 10, 220050, г. Мінск.

Сярод усіх удзельнікаў апытання, якія даслалі лісты ў пазначаны тэрмін з правільна запоўненай анкетай і якія назвалі марку-пераможца, будуць разыграны прызы: наборы філатэлістычнай прадукцыі.

Лепшай будзе прызнана тая паштовая марка альбо блок, за якую прагаласуе большасць удзельнікаў.

http://www.belpost.by/press-centre/news-company/4271.html

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/28-01-2019-4005*